# ВОДЗЫЎ

на аўтарэферат дысертацыі БУЙКО Цімура Сяргеевіча "Этымалагічныя гнёзды дэндралагічнай лексікі ў беларускай і польскай мовах на агульнаславянскім фоне: параўнальна-гістарычны аспект", прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасцях 10.02.01 – беларуская мова, 10.02.03 – славянскія мовы (Мінск, 2023. 25 с.).

Дэндронімы – надзвычай важны пласт лексікі, які фарміраваўся на працягу доўгага часу пад уплывам розных лінгвістычных і пазалінгвістычных фактараў і мае шырокі дэрывацыйны патэнцыял. Вытворныя ад дэндронімаў лексемы адрозніваюцца шырокім наборам дэнататаў. Дысертацыйная праца Ц.С. Буйко прысвечана этымалагічным гнёздам дэндралагічнай лексікі беларускай і польскай моў. Даследчык разглядае адно з фундаментальных пытанняў мовазнаўтва – этымалагізацыю дэндралагічнай лексікі беларускай і польскай меў, якая ў працы аб'яднана ў этымалагічныя гнёзды, апорным словам якіх становяцца адпаведныя дэндронімы. Менавіта этымалагічныя гнёзды дэндралагічнай лексікі беларускай і польскай моў і з'яўляюцца аб'ектам даследавання дысертацыйнай работы. Адзначанае абумовіла актуальнасць даследавання. Сапраўды, "айчынныя даследаванні ў галіне індаеўрапеістыкі дазволяць больш поўна асэнсаваць месца беларускай мовы як ва ўласна славянскай, так і ў індаеўрапейскай перспектыве, а таксама знайсці для беларускай дэндралагічнай лексікі новыя этымалагічныя рашэнні" (с. 3). Шырокі факталагічны матэрыял, сабраны з лексікаграфічных крыніц – этымалагічных, гістарычных, тлумачальных, дыялектных, анамастычных слоўнікаў розных славянскіх і неславянскіх моў – дазваляе аўтару зрабіць аб'ектыўныя, навукова аргументаваныя высновы і знасці новыя этымалагічныя прапановы для асобных слоў.

Комплексны падыход, які ўключае этымалагічны, параўнальна-гістарычны, апісальны метады, адпавядаюць вызначаным мэце і задачам даследавання. Асобна важна падкрэсліць, што інтэграцыйны падыход да аналізу лексікі беларускай і польскай моў – фактычна аб'яднанне ў межах

этымалагічнага гнязда беларускіх і польскіх лексем – дазваляе аўтару знайсці такія этымалогіі, якія былі б невідавочныя пры разглядзе адзначаных лексем у межах асобных моў. Важным таксама падаецца выбар моў – беларускай і польскай, якія з’яўляюцца генетычна роднаснымі, суседнімі, вызначаюцца ўзаемным уплывам на розных этапах развіцця. Такі выбар моў для аналізу дазваляе цэласна ацаніць шляхі развіцця лексічнага фонду, а таксама найбольш поўна адлюстраваць дэрывацыйныя і этымалагічныя сувязі.

Істотным элементам дысертацыйнай працы з’яўляецца даследаванне ўплыву народных уяўленняў пра дрэвы на фарміраванне дэндралагічнай лексікі. Этналінгвістычныя даныя ў гэтым выпадку бачацца неабходным грунтам для шэрагу этымалогій.

Навуковая навізна дысертацыйнай працы заключаецца ў фарміраванні і аналізе этымалагічных гнёздаў дэндралагічнай лексікі, выкарыстанні комплекснага падыходу да этымалагізацыі як дэндронімаў, так і дэндралагічнай лексікі (з улікам этналінгвістычных, гістарычных, уласна лінгвістычных і іншых фактаў), што праводзіцца ўпершыню ў беларускім мовазнаўстве.

Навуковыя палажэнні, якія аўтар выносіць на абарону, уяўляюцца значнымі і абгрунтаванымі, яны ў поўнай меры адлюстроўваюць ступень навізны работы.

Аўтарэферат адлюстроўвае структуру дысертацыйнай работы, раскрывае значэнне тэрмінаў, якімі карыстаецца аўтар (этымалагічнае гняздо, дэрывацыйныя сувязі, этымалагічны аналіз і інш.), змяшчае частку этымалагічнага гнязда з вяршыняй **kalina*, што дазваляе найбольш поўна ўявіць асаблівасці фарміравання этымалагічных гнёздаў у цэлым. Пададзенае ў аўтарэфераце агульнае апісанне іншых этымалагічных гнёздаў з адпаведнымі апорнымі словамі сведчыць пра вялікі аб’ём аналітычнай працы, праведзенай аўтарам.

Адзначу таксама грунтоўную і ўсебаковую апрабіраванасць тэарэтычных і практычных вынікаў дысертацыйнай працы на міжнародных

навуковых канферэнцыях і ў публікацыях аўтара, што дазваляе гаварыць пра навуковую выверанасць і аб’ектыўнасць высноў.

Такім чынам, дысертацыя Цімура Сяргеевіча Буйко абапіраецца на грунтоўную тэарэтычную базу, мае лагічную структуру, адлюстраваную ў аўтарэфераце, з’яўляецца паслядоўнай і аргументаванай, адпавядае спецыяльнасцям 10.02.01 – беларуская мова, 10.02.03 – славянскія мовы, а аўтар заслугоўвае прысваення вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па адзначаных спецыяльнасцях.

Доктар філалагічных навук, прафесар,
дырэктар Цэнтра вывучэння Беларусі
ў Аньхойскім універсітэце




І.А. Швед

26.12.2023 г.